PolotskSU



УДК 94(476)

# МАЙСЯЁНАК АНДРЭЙ ГЕОРГІЕВІЧ – ГРАВІТАЦЫЯ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

*д-р гум. навук Ю. ЗЯМЧОНАК*
Грамадская Акадэмія навук, Варшава

*Артыкул прысвечаны выдатнаму навукоўцу – Андрэю Георгіевічу Майсяёнку, аўтару больш за 450 навуковых прац, 7 манаграфій, 20 патэнтаў і пасведчанняў на вынаходствы. Анрэй Георгіевіч паходзіць з Глубоччыны. Імя Андрэя Георгіевіча Майсеёнка ўнесена ў такія прэстыжныя біяграфічныя сусветныя выданні як "Хто ёсць хто ў еўрапейскіх даследаваннях і развіцці (Who's who in European research and development)" і " Хто ёсць хто сучаснікі (the Contemporary who's who)". Ён абраны членам-карэспандэнтам міжнароднай АН Еўразіі (1995), сапраўдным членам (акадэмікам) міжнароднай АН Еўразіі (1997).*

Бягучы – 2018 год юбілейны таксама для выдатнага суайчынніка, якім ганарыцца ўся краіна, Андрэя Георгіевіча Майсяёнка [1]. За сваё жыццё, ён прайшоў шлях ад маляўнічых краявідаў азёрнага краю паўночна-усходняй Віцебшчыны і сумежжа культур Беларусі, Літвы і Латвіі да крутагор’я вяршынь навуковых дасягненняў еўрапейскага маштаба і шматграннай дзейнасці ў галіне адукацыі і асветы, гісторыі медыка-біялагічных навук, краязнаўства, публіцыстыкі, культуры і грамадскага жыцця.

Паходжанне Майсяёнкаў звязана са стараверскімі каранямі [2]: супольнасцю, якая ў сваю чаргу выводзіцца са скандынаўска-усходнееўрапейскай даўніны, а менавіта, з вікінгска-славянскага субстрату – ўсебакова адоранага, запачаткаваўшага паўстанне і развіццё старарускіх дзяржаў, у тым ліку і Беларусі або “Дабрарусі” – ўжываючы акрэслення Тадэўша Канвіцкага. Лёс Андрэя Георгіевіча смела пераадольвае стэрэатыпы, што ў сучасным свеце нельга быць чалавекам Рэнесансу – дасягаць поспехаў адначасова ў розных галінах.

Андрэй Майсяёнак нарадзіўся ў сям’і лекара, колішняга стуэнта і магістра медыцыны слыннага Віленскага ўніверсытэта імя караля Стэфана Баторыя, Георгія Нікіфарафіча і сакурсніцы па гэтай вучэльні, настаўніцы Антаніны Фёдараўны, 1 ліпеня 1943 года ў Глыбокім, дзе часцяком праляцела Андрэева ранняе дзіцінства. Нейкі час Майсяёнкі жылі ў доме, дзе цяпер знаходзіцца рэгіянальны архіў. Пасля драматычных перажыццяў часоў ваеннага ліхалецця яны ў 1948 г. апынуліся ў мястэчку Варапаева – райцэнтры Дунілавіцкага раёна, надзвычай прыгожа размешчанага сярод каскадаў лясных азярцоў, рачулак і ставаў. Сталая праца бацькі, як заснавальніка хірургічнага аддзялення мясцовай райбальніцы і маці – настаўніцы біялогіі тутэйшай школы спрычыніліся да стабілізацыі іх быту. Да сённяшніх дзён навакольныя жыхары добрым словам успамінаюць патрабавальную, але разам з тым і спагадлівую “біялагічку” Антаніну Фёдараўну, якая асабіста ведала народнага масака Язэпа Драздовіча. Не забываюць, і не толькі варапаеўцы, хірурга “ад бога” – Георгія Нікіфарафіча Майсяёнка [3]. Пад яго кіраўніцтвам у 1970-я гады працавала і мая мама, а таму ведаю аб ім не выпадкова. Майсяёнкі былі ў добрых адносінах са знакамітымі

PolotskSU



аграномамі Сікорамі, у тым ліку, з "графскім" садаводам Іванам Паўлавічам. На дэкаду пяцідзесятых прыпаў насычаны пазітыўнымі падзеямі і ўражаннямі "варапаеўскі" перыяд жыцця Андрэя. Яго школьная "дзесяцігодка" у 1949-59 гг. – гэта бурлівы міх посьпехаў у адукацыі і спорце, у тым, валейбольным (дастаткова прыгадаць тытул двухкратнага чэмпіёна маладзечанскай вобласці), а таксама – музычнай самадзейнасці пад кіраўніцтвам таленавітага кампазітара і выканаўцы І. Ф. Сушко, лёс якога ў свой час сутыкнуў з Лідзіяй Русланавай і іншымі знакамітасцямі расійскай эстрады. Трыо баяністаў "-ёнкаў": Майсяёнак, Каралёнак і Кіёнак – легенда варапаеўскай фальклёрнай традыцыі.

Медыцынскі інстытут (1959-1965 гг.) стаў лагічным працягам сямейных традыцый, дзе ў Гродна Андрэй пазнаёміўся з біяхімікам і апантаным вітамінолагам Ю. М. Астроўскім – будучым акадэмікам і прафесарам, які у значнай ступені прадвызначыў даследчы вектар свайго вучня [4]. Заняткі ў гуртку Кафедры біяхіміі, а таксама на пасадзе старшыні Студэнцкага навуковага таварыства Гродненскага медінстытута – гэта ўжо быў пралог аспірантуры, перарванай 13 месяцамі вайсковай службы, дарэчы, менавіта ў Полацку, у танкавым палку загадчыкам медыцынскага пункта.

Толькі адно пералічэнне даследчых дасягненняў і кар'ерных поспехаў А.Г.Майсяёнка, які з'яўляецца носьбітам практычна ўсіх навуковых званняў і тытулаў у Беларусі, застаючыся па-ранейшаму сціплым і душэйным, заняло б некалькі старонак. Нельга не прыгадаць, што ён з'яўляецца членам-карэспандэнтам НАН Беларусі (2000 г.), акадэмікам Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі (1997 г.), прафесарам, доктарам біялагічнын навук. З агульнай лічбы больш 700 аўтарскіх і сааўтарскіх публікацый каля 200 прысвечаны праблематыцы гістарычнай [5].

У межах тэматыкі краязнаўчай хацелася б прыадчыніць яго скарбонку ў галіне мікрагісторыі, сягаючы вытокаў немінаючага зачаравання Андрэем Георгіевічам мінуўшчынай бацькаўшчыны. Без сумневу, радавыя сагі, уражанні дзяцінства і юнацтва разам з глыбокай назіральнасцю навакольнага свету на тле эпохаў трансфармацыі спрычыніліся паўстанню цікавасці да рэгіянальнай праблематыкі. Не мог не натхняць шырокую натуру А. Майсяёнка і насычаны на кожным кроку гістарычнай спадчынай край наш: дзівосная прыстань загадак і цудаў, як называў беларуска-літоўскія пушчы – славянабалцкія джунглі ліцьвінскі Гамэр, знакаміты паэт-рамантык Мікалай Гусоўскі ва ўзнёслай одзе тутэйшай прыродзе – слыннай паэме "Песня пра зубра" [6]. Таксама інспіравалі А. Майсяёнка і родныя ваколіцы, у тым ліку, "графскае" мінулае Варапаеўскага Паазер'я – раскінутага пры старажытным каралеўскім батораўскім гасцінцы – колішнім шляху Вільня-Полацк сярод лясных абшараў і лугавых прастораў, забалочаных нізінаў і пагоркавых ўзвышшаў на ўзбярэжжах трох глыбокаводных азёраў і ракі Зарніцы са шматлікімі яе прытокамі. З таго факту, што за бліжэйшым да цэнтра ўласна Варапаева возерам, дзе амаль круглы год рыбачаць, а летам пляжуюць мясцовыя жыхары, а таксама не шматлікія турысты і якое гарадок ахоплівае паўдугой, не замацавалася на стала назва "Варапаеўскае", а цягнецца с пакон вякоў – "Шабаноўскае" (ад бліжэйшай вёскі) можна рабіць выснову аб заснаванні паселішча на беразе ракі, аб "рачной" яго генэзе. Першы асядленец аблюбаваў хутчэй за ўсё гушчары лясістага крутагор'я на левым беразе, дзе пазней узнікла рэзыдэнцыя магнатаў Тызэнгаўзаў герба "Буйвал" – патомкаў крыжакоў з Курляндыі, а на мяжы XIX/XX стст. паўстаў шыкоўны палац з прысядзібнымі пабудовамі пасярод агромністага леса-паркавага масіву, "ліцьвінаў з продкаў" – Пшэздзецкіх герба Шахматная Вежа. Стары

PolotskSU



графскі парк – адзін з не шматлікіх ва ўсёй Беларусі нейкім цудам ацалеў у завірухах нелітасьцівага часу амаль ў першазданым выглядзе. Знаходзіцца ён над ужо перасохшым і знікшым не так даўна штучным вадаёмам – абшырным ставам, утвораным высокай плацінай на Зарніцы, на супраць даўняга млына – цяпер апраўленага прыватнага будынка з чырвонай цэглы каля самага новаадрамантаванага маста. Стоячы на гэтай пераправе тварам на поўдзень – супраць цячэння ракі насуперак няўмольнаму часу цікаўны тутэйшы "абарыген" – мясцовы жыхар, як і дапытлівы вандроўнік, углядваючыся ў далечыню водасховішча, могуць сабе ўявіць і далёкую мінуўшчыну паходжання рачнога гарадка над азярцом. Зарніца, несучы свае чысцюткія празрыстыя воды ў Балтыйскае мора, запаволена разліваючыся ў далінах месцамі да 150 м., шчодрая на назвы, з'яўляецца найбуйнейшай артэрыяй воднай рэгіёну сярод некалькіх сот гідранемічных аб'ектаў, з якіх, 24 "сястры" – рэчкі і больш 300 рознага рода „братоў"- ручаёў, каналаў і т.п. Яна ігрыва віецца серпантынавай стужкай праз сумежжа трох раёнаў: Мядзельскага (Мінскай вобласці), Пастаўскага і Шаркаўшчынскага (Віцебскай), дзе разгалінаваліся родзічы Майсяёнкаў. У тым парку, які ў савецкія часы атрымаў назу "культуры і адпачынку" і дзе штогод адбывалася шмат розных імпрэзаў, ён добра памятае манументальны гмах графскага палацу ў нэараманскім стылю з фантанам і вальерамі для звяроў. Улюбёнай забавай падлеткаў была лыжная фрайда з горкі каля мураванага доміка вартаўніка, у якім пазней жыў мой аднакласнік Невяроўскі па мянушцы "Муля". А колішняя працаўніца графскай сядзібы пані П.Лаўнікоўская дык часцяком блытала Андрэя з панічам Канстанцінам (графам Пшэздзецкім). Усё гэта вытокі краязнаўчай творчасці А.Майсяёнка, з якой варта прыгадаць яго даследванні прысвечаныя заснавальніку першых медычных устаноў ў межах сучаснай Беларусі: Гарадзенскай Медыцынскай Академіі і іншых асяродкаў – Ж.Жыліберту (1741-1814); знакамітаму натуралісту: стваральніку арнітолагічнай навукі на колішніх землях І Рэчы Паспалітай і аднаго з буйнейшых у Еўропе – Пастаўскага заалагічнага музея Канстанціну Тызэнгаўзу (1786–1853); слыннаму канструктару амерыканскай ракетнай тэхнікі, прадаўжальніку справы Казіміра Семяновіча, Барысу Кіту (1910–2918); мастаку-футуролагу і вандроўніку Язэпу Драздовічу (1888–1954), дарэчы на адну з літаграфій якога я натрапіў у 2016 г. у зборах а.Надсана у Беларускай Бібліятэцы і Музеі Ф.Скарыны ў Лондане.

У адносінах да постаці Б. Кіта прыгадваюцца два факты. Першы, калі ў далёкія ўжо 1990-я гг. мне, пачынаючаму настаўніку, давялося перадаваць ад Андрэя Георгіевіча з Гродна Пастаўскаму музею манаграфію Лідзіі Савік прысвечаную Б.Кіту з яго (Кіта) аўтографам. Другі: на стары Новы Год 2018 з калегамі з Варшавы я праведаў А. Майсяёнка ў гродненскім Інстытуце Біяхіміі. Раптам зазваніў тэлефон – на сувязі з Германіі быў 107-гадовы волат амерыканскай астранаўтыкі Барыс Кіт.

А. Майсяёнак – аўтар сэрыі навукова-папулярных артыкулаў аб выдатных навукоўцах-земляках сучасніках: З. Лоўкісе, М. Казароўцу, П. Пронька, І. Залуцкім і інш.; стваральнік Гарадзенскай краязнаўчай асацыяцыі пры абласным аддзяленні Беларускага Фонда Культуры; арганізатар і прэлегент канферэнцый і кангрэсаў, сярод якіх, гарадзенскі "Наш радавод", Навагрудкія, Браслаўскія, Дзісненскія чытанні, а таксама шмат іншых; ініцыятар усталявання ў Гродне помніка Вітаўту Вялікаму, барэльефа (таксама ў Полацку) і кабінета-музея акадэміку Ю. Астроўскаму ў Інстытуце Біяхіміі, памятных: знака "Пагоня на Грунвальд" і – крыжа на месцы пахавання сям'і О'Браін дэ Лэсі; помніка "Сям'я Нарбутаў"

PolotskSU



у Воранаўскім раёне і крыжа – маці Б.Кіта ў Карэліцкім раёне. А. Майсяёнак аднавіў помнік народнаму лекару С. Нарбуту ў Браславе, папоўніў экспазіцыі і фонды мінскага музея гісторыі медыцыны, гродненскага музея-аптэкі і іншых краязнаўчых музеяў. Акрамя гэтага, ён заснавальнік шэрагу рэгіянальных газетных выданняў і персанальнага фонда ў Глыбоцкім рэгіянальным архіве, сааўтар праекта “500” краязнаўцаў Гарадзеншчыны. Нельга не прыгадаць, што ў канцы 1980-х гадоў А. Майсяёнак прычыніўся да даследавання месца пахавання Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў Воўчыне Брэсцкай вобласці. Узнагароджаны медалём “За працоўную адзнаку”, лаўрэат прэмій: імя Б. Кіта і за беларуска-польскае супрацоўніцтва ў галіне культуры.

ЛІТАРАТУРА

1. Майсяёнак Андрэй Георгіевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларус і: У 6 т. Т. 6. Кн. 2 / рэдкал. : Г.П. Пашкоў (гал. рэдактар) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2003. – С. 411.
2. Кожан, К. Незабыўныя гады. Успаміны Андрэя Майсяёнка / К. Кожан // Вольнае Глыбокае. – № 39(703), 40 (704).
3. Зямчонак, І. Хірург ад Бога / І. Зямчонак // Пастаўскі край. – 1997. – № 38 (7600).
4. Ловкіс, З. В науку из Воропаевской школы / З. Ловкис // Пастаўскі край. – 2013. – № 43 ; Под флагом нутрициологии // Веды. – 2013. – № 23.
5. Майсяёнак, А.Г. Краязнаўцы Пастаўшчыны (машынапісы) // А.Г. Майсяёнак. – 2017, 2018.
6. Гусоўскі, М. Песня пра зубра: На лацін., беларус., рус. мовах / М. Гусоўскі. – Мінск : Маст. лит., 1980. – 192 с.

GRAVITY OF THE FATHERLAND

*A. MOISEENOK*

*The article is devoted to the outstanding scientist – Andrei Georgievich Moiseenko, the author more than 450 scientific papers, 7 monographs, 20 patents and certificates for inventions. Anna G. originally from Glybochchyny. The name of Andrei Georgievich Maiseenka included in such a prestigious world biographical edition of "who's Who in European research and development (who's who in European research and development)" and " who's Who of contemporaries (the Contemporary who's who)". He was elected a corresponding member of the international Academy of Sciences of Eurasia (1995), full member (academician) of the international Academy of Sciences of Eurasia (1997).*